**Прадзеіна А.В., Саітава В.І.** (Мінск)

# КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АБЛАСНЫХ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ: РЭАЛІІ І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

*Акцэнтуецца ўвага на сутнасці краязнаўчай функцыі абласной бібліятэкі згодна з поглядамі асобных навукоўцаў і яе рэалізацыі ў дзейнасці сучасных айчынных бібліятэк. Паказваюцца праблемы розных напрамкаў дзейнасці абласных бібліятэк Беларусі ў галіне краязнаўства, якія патрабуюць іх вырашэння.*

У функцыянальнай структуры сучаснай абласной бібліятэкі (АБ) спецыялісты вызначаюць краязнаўчую функцыю як найбольш выразную. Б.Ф. Валодзін, які першым абгрунтаваў гэту функцыю, сутнасць яе бачыць у стварэнні рэгіянальнай памяці – дакументнай і інфармацыйнай, а таксама ў каардынацыі дзейнасці бібліятэк і іншых сацыяльных інстытутаў па краязнаўстве [6]. Ён падкрэсліў, што яна з’яўляецца галоўнай, вызначальнай у дзейнасці абласных бібліятэк. Краязнаўчая функцыя знаходзіцца ў арганічнай еднасці з інфармацыйнай, культурна-асветнай і адукацыйнай сацыяльнымі функцыямі. Н.Н. Кушнарэнка адзначыла прыкладны характар краязнаўчай функцыі, таму што яна мае выразнае практычнае прызначэнне – фактычна пранізвае ўсе кірункі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці [16]. У сваіх працах Р.С. Мацульскі, Г.І. Кукатава [15, с. 29, 31, 35; 18; 19] да тыпаўтваральных функцый АБ адносяць функцыі рэгіянальнай памяці і рэгіянальнай бібліятэчнай палітыкі, якія заключаюцца ва ўсеагульным і максімальна поўным раскрыцці ўнікальнасці канкрэтнага рэгіёна, яго духоўнай спадчыны, навуковай і культурнай дзейнасці. І.М. Стрыжонак і В.І. Саітава адзначылі інтэгральны характар краязнаўчай функцыі. Яна аб’ядноўвае ў цэлае ўсе элементы сістэмы «бібліятэка» і ў той жа час раскрывае канкрэтны сэнс, змест кожнага элемента з улікам краязнаўчай спецыфікі. Праяўленне краязнаўчай функцыі ў розных кірунках дзейнасці бібліятэк садзейнічае абмену рэгіёназнаўчымі ведамі і інфармацыяй у соцыуме, назапашанню і трансляцыі дакументаваных краязнаўчых ведаў, мясцовага сацыяльнага вопыту, перапрацаваных і ацэненых з пазіцый каштоўнасцей грамадства і рэгіянальнай супольнасці

ў канкрэтны гістарычны перыяд [23]. Найбольш поўна праяўленне краязнаўчай функцыі рэалізуецца праз наданне бібліятэкай прыярытэтнага значэння краязнаўству ў фондафарміраванні, вядзенні каталогаў і картатэк, баз даных (БД), падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў, абслугоўванні карыстальнікаў, папулярызацыі краязнаўчых ведаў, навукова-метадычнай дзейнасці, удзеле бібліятэкараў у краязнаўчых даследаваннях і інш. Аналіз розных пунктаў гледжання тэарэтыкаў, практыкаў па гэтым пытанні дазваляе нам пагадзіцца з высновай Г.І. Кукатавай аб тым, што «предметом особой ответственности, вкладом региональных библиотек в сохранение отечественного и мирового культурного наследия является краеведческая направленность их деятельности» [15, с. 58].

У краязнаўчай дзейнасці АБ нашай краіны дасягнулі немалых поспехаў, але далейшая трансфармацыя бібліятэчнай справы, звязаная з укараненнем інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, патрабуе пастаяннага ўдасканалення бібліятэчнага краязнаўства, пераасэнсавання не толькі традыцыйных сувязей з карыстальнікамі і іншымі знешнімі суб'ектамі бібліятэчнага ўздзеяння, але і пошуку новых шляхоў узаемадзеяння паміж імі, клопату аб годным прадстаўленні культурных дасягненняў рэгіянальных супольнасцей нашай краіны ў шэрагу шматлікіх і разнастайных лакальных і нацыянальных культур сучаснага свету.

На сучасным этапе назіраецца трансфармацыя бібліятэк у поліфункцыянальныя ўстановы (інфармацыйныя, культурныя, сацыяльныя, адукацыйныя), што падцвярджае іх інфармацыйны і інтэлектуальны патэнцыял, здольнасць адаптавацца да зменлівых патрэбнасцей знешняга асяроддзя. Абласныя бібліятэкі пазіцыянуюцца як рэгіянальныя інфармацыйна-бібліятэчныя, сацыякультурныя (у тым ліку музейныя), адукацыйныя, турысцкія цэнтры рэгіёна. На іх базе паспяхова функцыянуюць цэнтры прававой інфармацыі, цэнтры інфармацыі па культуры і мастацтве, інфармацыйныя цэнтры культурнага турызму і інш. [3; 5; 9; 10; 11; 15, с. 79, 80; 22].

Значная роля абласной бібліятэкі як інфармацыйнага цэнтра праяўляецца ў стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы рэгіёна, унікальная частка якой прадстаўлена краязнаўчымі і мясцовымі інфармацыйнымі рэсурсамі. Адной з галоўных праблем у дадзеным кірунку застаецца фарміраванне фонду краязнаўчых і мясцовых дакументаў абласных бібліятэк, які можа разглядацца

як своеасаблівы помнік матэрыяльнай і духоўнай культуры вобласці. Актуальным застаецца забеспячэнне яго максімальнай паўнаты. Сярод галоўных крыніц папаўнення гэтага фонду важнейшая роля належыць абавязковаму бясплатнаму экзэмпляру. У рамках пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Об утверждении Положения об обязательном бесплатном экземпляре документов и признании утратившими силу некоторых постановлений правительства Республики Беларусь» ад 03.09.2008 № 1284 (у рэд. ад 10.08.2009 № 1052) (далей Палажэнне) быў пашыраны відавы склад дакументаў, якія выпускаюцца арганізацыямі вобласці і паступаюць у абласную бібліятэку [20]. Але нявырашаным засталося пытанне ўключэння ў пералік абавязковага экзэмпляра аўдыявізуальных дакументаў. Магчыма паставіць пытанне аб неабходнасці ўключэння ў склад абавязковага бясплатнага экзэмпляра мясцовых выданняў, які паступае ў абласныя бібліятэкі, друкаваных картаграфічных выданняў і іншых відаў дакументаў, што дазволіла б абласным бібліятэкам забяспечыць максімальную паўнату, павысіць навуковую каштоўнасць, відавую разнастайнасць фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Фарміраванне фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў электроннымі выданнямі, арганізацыя доступу да сеткавых інфармацыйных рэсурсаў, патрабуе ад бібліятэк вырашэння пытанняў іх набыцця, захаванасці з магчымасцямі прадастаўлення да іх пастаяннага доступу карыстальнікаў. Застаецца праблемай камплектаванне фондаў мясцовымі малатыражнымі выданнямі. Так, зацверджанае Палажэнне не распаўсюджваецца на дакументы, якія выпускаюцца тыражом менш за 10 экзэмпляраў. На жаль, выдавецкія арганізацыі рэгіёнаў не заўсёды забяспечваюць паўнату і своечасовасць паступлення ў бібліятэку сваёй друкаванай прадукцыі, што супярэчыць патрабаванням гэтага дакумента [12].

У захаванасці рэтраспектыўнай часткі фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў абласных бібліятэк прыярытэтным з’яўляецца стварэнне (і/ці набыццё) электронных копій каштоўных краязнаўчых выданняў, мясцовага перыядычнага друку. Абласныя бібліятэкі нашай краіны маглі б стаць цэнтрамі па стварэнні электронных архіваў мясцовай перыёдыкі, які б уключаў электронныя копіі перыядычных выданняў за ўвесь час іх існавання. На жаль, ускладняе праблему стварэння электронных паўнатэкставых

калекцый дадзенага кірунку адсутнасць поўных камплектаў перыядычных выданняў, якія выходзілі ў мінулым на тэрыторыі рэгіёнаў, іншых каштоўных краязнаўчых дакументаў, адмоўна сказваецца і адсутнасць адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай базы абласных бібліятэк для ажыццяўлення алічбоўкі дакументаў, набыцця іх электронных копій. Змаглі вырашыць для сябе гэтыя праблемы і пачаць працу па ўзнаўленні фонду рэдкіх каштоўных краязнаўчых, мясцовых дакументаў Віцебская і Магілёўская абласныя бібліятэкі: яны мтвараюць адпаведныя паўнатэкставыя базы даных. Адна з крыніц фарміравання паўнатэкставых калекцый названых абласных бібліятэк – заказ на выраб электронных копій Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ), што рэалізуе шэраг праектаў па стварэнні лічбавых калекцый рэдкіх і каштоўных выданняў, у складзе якіх ёсць выдатныя крыніцы, прысвечаныя рэгіёнам Беларусі: «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917 г.», «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.» і інш. Лічбавае ўзнаўленне ўнікальных крыніц аб прыродных умовах, эканоміцы і насельніцтве сярэдзіны XIX – пачатку XX ст. мела істотнае значэнне для ліквідацыі лакун сацыяльнай памяці і, адпаведна, умацавання ролі гэтых бібліятэк у справе захавання і распаўсюджвання краязнаўчых ведаў.

Папаўняюцца краязнаўчыя фонды абласных бібліятэк таксама рукапісамі, фотадакументамі, планамі/чарцяжамі мясцовасцей, забудоў, населеных пунктаў і іншымі ўнікальнымі матэрыяламі, што набываюць бібліятэкі ці атрымліваюць у якасці дара ад краязнаўцаў, пісьменнікаў, вучоных і ствараюць базу для пашырэння навуковых даследаванняў рэгіянальнай дакументальнай спадчыны. Для АБ спецыфічна наяўнасць у фондах неапублікаваных краязнаўчых і мясцовых дакументаў: рукапісных дзённікаў, асабістых дакументаў, уключаючы пашпарты, фотаздымкі, лісты і інш. Такія матэрыялы павялічваюць навуковую каштоўнасць краязнаўчых фондаў, яны могуць быць выкарыстаны ў даследчых мэтах. Атрыманне такога роду дакументаў у пэўнай ступені залежаць ад таго, наколькі бібліятэка пазіцыянавала сябе ў якасці буйнейшага інфармацыйна-камунікатыўнага цэнтра краязнаўства.

У мэтах давядзення краязнаўчай інфармацыі да інвалідаў па зроку і сляпых, іншых асоб з абмежаванымі магчымасцямі настаў час выпуску даступных для іх адпаведных дакументных крыніц,

у тым ліку з выкарыстаннем электронных сродкаў, аўдыядакументаў. Абласным бібліятэкам мэтазгодна выступаць з ініцыятывай стварэння такіх дакументаў, фарміраваць электронныя інфармацыйныя рэсурсы па краязнаўстве з магчымасцю іх выкарыстання такой катэгоряй карыстальнікаў.

На падставе даных па вывучэнні краязнаўчага фонду і інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў абласныя бібліятэкі могуць уносіць прапановы па выданні, перавыданні каштоўных краязнаўчых дакументаў і ўплываць на рэпертуар сацыяльна значнай літаратуры, фарміраванне культуры чытання дзяцей, юнацтва і іншых катэгорый насельніцтва.

Абласным бібліятэкам неабходна ўзмацніць сваю ролю як інфармацыйных і каардынацыйных цэнтраў па краязнаўстве ў рэгіёне. Гэты напрамак з'яўляецца вельмі актуальным і характэрным для розных кірункаў дзейнасці АБ па стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы рэгіёна на карпаратыўнай аснове: у распрацоўцы зводных планаў камплектавання краязнаўчых фондаў рэгіёна, фарміраванні зводных інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве; прадастаўленні краязнаўчых бібліятэчных сэрвісаў і інш. Для гэтага створаны даволі спрыяльныя ўмовы. Так, у выніку рэалізацыі галіновых і дзяржаўных праграм апошняга дзесяцігоддзя здзейснена падключэнне оптавалаконнымі каналамі сувязі ў адзіную карпаратыўную сетку НББ, рэспубліканскіх галіновых, абласных бібліятэк і бібліятэк ВНУ. Выкарыстанне нацыянальных камунікатыўнах фарматаў BELMARC па стварэнні бібліяграфічных і аўтарытэтных/нарматыўных запісаў стала асновай для рэалізацыі нацыянальнай сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі, стварэння зводнага электроннага каталога і інш. У дадзеным напрамку важна адзначыць, што ў сувязі з укараненнем у дзейнасць абласных бібліятэк праграмнага забеспячэння ALIS-web (з выкарыстаннем фармату BELMARC для стварэння бібліяграфічных запісаў, у тым ліку і па краязнаўстве) актуальным з'яўляецца вырашэнне праблемы стварэння якаснай краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі. Гэта немагчыма без стварэння бібліяграфічнага запісу на састаўную частку дакумента з аднатомных і шматтомных кніг, выданняў з працягам, што можа быць прадстаўлена главой, раздзелам, параграфам, фрагментам тэксту і г. д. Важнасць такой работы абумоўлена

значнай колькасцю краязнаўчых дакументаў, што прадстаўлены менавіта аналітычным матэрыялам. Вырашэння патрабуюць пытанні машыннага фарміравання краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў тыпу «Новая літаратура аб ... вобласці (раёне, горадзе, мястэчку і г. д.)», якія на бягучы момант немагчыма ствараць з-за недапрацаванасці праграмнага забеспячэння, удзелу АБ у фарміраванні аўтарэтытных запісаў, стварэння пошукавага вобразу краязнаўчых дакументаў на беларускай і рускай мовах і інш.

Паспрыяе ўніфікацыі, далейшаму ўдасканальванню і пашырэнню дзейнасці па зборы і захаванні краязнаўчага матэрыялу абавязковае ўкараненне ў практыку работы бібліятэчных сістэм краіны праграмнага прадукту «Памяць рэгіёна», створанага НВФ «ІНЕАК». Інавацыйнай формай работы стала прадстаўленне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў абласных бібліятэк праз віртуальную чытальную залу НББ [25]. Але для пабудовы адзінай інфармацыйнай прасторы рэгіёна трэба абавязкова вырашыць пытанні магчымасці супрацоўніцтва з бібліятэкамі, іншымі ўстановамі рознай ведамаснай прыналежнасці, асабліва музеямі і архівамі, сумяшчэння праграмнага забеспячэння, якое яны выкарыстоўваюць. Напрыклад, у Полацкім дзяржаўным універсітэце вядуцца паўнатэкставыя БД: «Проблемы экологии: Полоцкий регион», «История образования на Полотчине» і ўніверсальная бібліяграфічная БД «Краеведение». Такая краязнаўчая дзейнасць бібліятэк, гэтага і іншых універсітэтаў нашай краіны – важны кірунак інфармацыйнага забеспячэння рэгіянальнага кампанента вучэбных дысцыплін, навуковых даследаванняў і выхаваўчага працэсу, значны ўклад у развіццё інфармацыйных рэсурсаў, прысвечаных абласцям, і відавочна патрабуе наступнага кроку – узаемадзення з абласнымі бібліятэкамі.

Да найважнейшых праблем дзейнасці абласных бібліятэк, якія патрабуюць новых падыходаў, належыць удасканаленне інфармацыйна-пошукавых сістэм па краязнаўстве, уключаючы падрыхтоўку і забеспячэнне доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў уласнай генерацыі, у тым ліку створаных на карпаратыўнай аснове, удасканаленне доступу да электронных рэсурсаў, прысвечаных рэгіёну ў прасторы Інтэрнэту. У АБ хутка папаўняюцца краязнаўчыя базы даных, даступныя праз электронныя

каталогі, расце колькасць электронных бібліяграфічных дапаможнікаў, ініцыяваны цікавыя і важныя праекты па стварэнні фактаграфічных, паўнатэкставых і камбінаваных БД, прысвечаных абласцям. Кожны з гэтых напрамкаў не толькі прызначаны для задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў у краязнаўчай інфармацыі і ведах, але і фарміруе імідж рэгіёна ў інфармацыйнай прасторы краіны і свету, спрыяе развіццю турысцкага патэнцыялу.

Перспектыўным доўгатэрміновым кірункам, на наш погляд, з'яўляецца фарміраванне зводных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку бібліяграфічных, і прадстаўленне ў Інтэрнэце зводных каталогаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў, створаных з удзелам бібліятэчных сістэм (у тым ліку Цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы – ЦБС), бібліятэк ВНУ, краязнаўчых музеяў, архіваў і іншых устаноў, фарміраванне і забеспячэнне доступу (праз Інтэрнэт ці лакальнага) да паўнатэкставых, камбінаваных і іншых электронных інфармацыйных рэсурсаў уласнай генерацыі.

Падставай для фарміравання зводнай інфармацыйнай прадукцыі з'яўляюцца БД краязнаўчай літаратуры, што функцыянуюць у АБ, і аналагічныя БД бібліятэчных сістэм (напрыклад, ЦБС). Пры ўкараненні механізму карпаратыўнага ўзаемадзеяння паміж галоўнымі фондасховішчамі краязнаўчых і мясцовых дакументаў карыстальнікі атрымаюць доступ да зводных каталогаў з максімальна поўным адлюстраваннем дакументальных краязнаўчых крыніц.

Рэальны шлях стварэння бібліяграфічнага рэпертуару мясцовых дакументаў бачыцца ў сувязі з распрацоўкай электроннага інфармацыйнага рэсурсу «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі», заданне на распрацоўку якога ўвайшло ў Дзяржаўную праграму «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. [10]. У рамках стварэння дадзенага рэсурсу, што з'яўляецца важнай часткай бібліяграфічнага рэпертуару нацыянальнага дакумента, дзяржаўнай бібліяграфіі [24], абласныя бібліятэкі павінны выступіць ў ролі рэгіянальных цэнтраў каталагізацыі і бібліяграфіі мясцовага друку, мэтамі якіх будзе прадстаўленне максімальна поўнай бягучай і рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі аб мясцовых дакументах.

Унікальны патэнцыял, на наш погляд, закладзены ў камбінаваных БД абласных бібліятэк: «Спадчына Гомельшчыны» Гомельскай АБ, «Памяць Міншчыны» Мінскай АБ, «Прыдзвінскі край:

гісторыя і сучаснасць», «Память Витебщины» Віцебскай АБ, «Край мой, Магілёўшчына» Магілёўскай АБ і інш. Гэтыя інфармацыйныя рэсурсы маюць перспектывы далейшага развіцця як праз папаўненне ідэальнымі аб'ектамі (краязнаўчымі ведамі, інфармацыяй, фактамі), так і матэрыяльна-духоўнымі (краязнаўчымі творамі, аўдыявідэадакументамі і інш.). Пашырэнне падобных энцыклапедычных электронных мультымедыйных рэсурсаў у Інтэрнэце, відавочна, садзейнічала б вырашэнню розных задач у полі ўласна краязнаўчай дзейнасці (даследчай, адукацыйнай, выхаваўчай) і задач па фарміраванні прывабнага вобраза края для тых, хто знаёміцца з ім.

Не кранаючы важных пытанняў праграмна-тэхнічных сродкаў, ад якіх залежыць выкананне сучасных электронных праектаў, пытанняў ўдасканалення краязнаўчага кантэнту сайтаў, іх афармлення, праблем кадравага забеспячэння, нельга не звярнуць увагу на не менш значную для іх рэалізацыі праблему карпаратыўнага ўзаемадзеяння. Абласным бібліятэкам важна ўзмацніць сваю ролю як каардынацыйных цэнтраў ў галіне краязнаўства ў рэгіёне. Станоўчы вопыт дзейнасці ў дадзеным кірунку ўжо набыты абласнымі бібліятэкамі ў рабоце з раённымі бібліятэкамі краіны па фарміраванні вышэй названых краязнаўчых камбінаваных БД, ёсць прыклады сумеснай работы бібліятэк памежных тэрыторый (Гомельскай, Чарнігаўскай, Бранскай па стварэнні тэматычнай БД «Древо дружбы» і інш). Хочацца адзначыць, што карпаратыўнае ўзаемадзеянне магчыма не толькі паміж бібліятэкамі асобных абласцей, але і ў межах рэгіёнаў, якія маюць гістарычныя сувязі, з'яўляюцца памежнымі тэрыторыямі. Гэта зрабіла б больш дасягальнай, эфектыўнай і эканамічнай дзейнасць па фарміраванні сукупнага краязнаўчага фонду рэгіёна, стварэнні зводных краяяназнаўчых электронных каталогаў, рэпертуарнага бібліяграфічнага ўліку мясцовых дакументаў, даведнікаў-навігатараў па краязнаўчых інтэрнэт-рэсурсах, стварэнне і выкарыстанне бібліятэчных сэрвісаў (рэгіянальнай службы «Спытай бібліятэкара» і інш.). Прапанаваныя падыходы да фарміравання інфармацыйных рэсурсаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў могуць разглядацца як шляхі карпаратыўнага ўзаемадзеяння з рэспубліканскімі бібліятэкамі і інфармацыйнымі цэнтрамі па стварэнні інфармацыйных рэсурсаў і сэрвісаў нацыянальнага ўзроўню: зводнага электроннага

каталога, нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, нацыянальнай электроннай бібліятэкі і інш. Хацелася б звярнуць увагу і на мэтазгоднасць пашырэння краязнаўчай тэматыкі ў афармленні сайтаў абласных бібліятэк як своеасаблівага гісторыка-культурнага сімвала рэгіёнаў. У прыватнасці, выражэнне тэрытарыяльнай адметнасці садзейнічала б пазіцыянаванню абласных бібліятэк у якасці краязнаўчых інфармацыйных цэнтраў у турыстычнай сферы, фарміраванню пазітыўнага турыстычнага іміджу, што актуальна з пазіцый сучасных задач рэгіянальнага развіцця.

Перспектыўным кірункам, на наш погляд, з'яўляецца фарміраванне і прадстаўленне ў Інтэрнэце інфармацыйных карпаратыўных парталаў па краязнаўстве, створаных на базе абласных бібліятэк краіны, якія б акумулявалі інфармацыю аб рэгіёне: змяшчалі інфармацыйныя рэсурсы, бібліятэчна-бібліяграфічныя сэрвісы ў мэтах задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў па краязнаўстве, папулярызавалі іх, выкарыстоўваліся ў метадычнай, навуковай, адукацыйнай дзейнасці. Сёння абласным бібліятэкам важна распачаць папулярызацыю сваёй краязнаўчай дзейнасці і краязнаўчых ведаў у сацыяльных сетках. Гэта дзейнасць знаходзіцца на пачатковым узроўні. Патрабуюць актуалізацыі і такія кірункі дзейнасці АБ, як навукова-даследчая, навукова-метадычная, адукацыйная ў галіне краязнаўства.

Сучасная тэрміналагічная сітуацыя дазваляе ужыванне тэрмінаў «абласныя бібліятэкі», «абласныя навуковыя бібліятэкі», «абласныя ўніверсальныя навуковыя бібліятэкі»[1]. Абласным бібліятэкам магчыма разглядзець пытанне выкарыстання ў нарматыўных прававых дакументах краіны тэрмінаў «абласная бібліятэка» і «абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка», ужыванне якіх пашырае або звужае напрамкі дзейнасці бібліятэк, у тым ліку па краязнаўстве. Сёння назіраецца тэндэнцыя перайменавання назвы аддзелаў краязнаўства на аддзелы беларускай і краязнаўчай літаратуры, пераўтварэння адпаведных аддзелаў у сектары,

---

[1] У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (у рэд. ад 31 снежня 2009 г. № 114-З) выкарыстоўваецца назва «абласныя бібліятэкі», у Палажэнні аб арганізацыі сукупнай сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь (ад 29 верасня 1993 г.) – «абласныя навуковыя бібліятэкі», у Палажэнні аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь (ад 28 снежня 1993 г.) – «абласныя ўніверсальныя навуковыя бібліятэкі».

мэтазгоднасць чаго вызывае сумненні, і адказы на гэтыя пытанні ўжо былі дадзены ў нашай гісторыі.

На наш погляд, такі падыход да арганізацыі краязнаўчай дзейнасці ў абласных бібліятэках як рэгіянальных цэнтрах бібліятэчнага краязнаўства не адпавядае сучасным сусветным тэндэнцыям яе развіцця, прывядзе да абмежавання і згортвання гэтага напрамку, што адмоўна паўплывае на стан краязнаўства наогул.

На жаль, на сучасным этапе няма рэспубліканскага нарматыўна-рэгламентуючага дакумента ў галіне краязнаўчай дзейнасці. Абласным бібліятэкам як рэгіянальным цэнтрам навукова-метадычный дзейнасці мэтазгодна звярнуць увагу на неабходнасць распрацоўкі новага дакумента (кіраўніцтва ці палажэння) замест існуючага раней Палажэння аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь (Мінск, 1993), у якім знайшлі б адлюстраванне сучасны стан і перспектывы развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ў галіне краязнаўства, у тым ліку і абласных бібліятэк як яго рэгіянальных цэнтраў. Абласныя бібліятэкі маглі б стаць ініцыятарамі перапрацоўкі Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь (Мінск, 1993) [14].

Патрабуецца абмеркаванне неабходнасці ўліку краязнаўчай дзейнасці бібліятэк у планава-справаздачнай дакументацыі. У прыватнасці, статыстычны ўлік краязнаўчых дакументаў у кнізе сумарнага ўліку паспрыяе больш эфектыўнаму фарміраванню іх фонду. Улік краязнаўчых даведак, у тым ліку па іх тыпах, будзе стымуляваць важныя напрамкі практычнай і пазнавальнай дзейнасці: вывучэнне інфармацыйных патрэб карыстальнікаў у галіне краязнаўства, аптымізацыя выкарыстання фонду краязнаўчых і мясцовых дакументаў, прагназаванне тэндэнцый у галіне бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Патрабуе вырашэння пытанне ўліку выкарыстання БД краязнаўчых і мясцовых дакументаў уласнай генерацыі. На сённяшні дзень у бібліятэках, якія ажыццяўляюць краязнаўчую дзейнасць (абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх), адсутнічае адзіны падыход да гэтых пытанняў. Для вырашэння праблемы ўліку электронных інфармацыйных рэсурсаў, што ствараюцца, як інтэлектуальнай уласнасці хацелася, каб АБ звярнулі ўвагу на важнасць іх рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэгістры

інфармацыйных рэсурсаў Беларусі[2] і скаардынавалі работу бібліятэк рэгіёна ў гэтым кірунку [8]. Гэта адпавядае пастанове Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь «О некоторых вопросах государственной регистрации информационных ресурсов и информационных систем и о признании утратившим силу постановления Министерства связи и информатизации Республики Беларусь от 28 ноября 2007 г. № 51» 05.08.2009 № 32 (у рэд. пастановы Міністэрства сувязі ад 20.12.2010 № 27).

Адна з новых тэндэнцый краязнаўчай дзейнасці АБ праяўляецца ў развіцці навукова-даследчай работы. Гэта характэрна для бібліятэк, якія сістэматычна вывучаюць краязнаўчую дакументальную спадчыну, мінулае і сучаснасць краю, плённа развіваюць узаемадзеянне з іншымі сацыяльнымі інстытутамі ў галіне краязнаўства і з асобнымі краязнаўцамі. Напрыклад, Магілёўская абласная бібліятэка разам з абласным краязнаўчым музеем, дзяржаўным універсітэтам імя А.А. Куляшова ўдзельнічае ў выданні навуковага зборніка «Магілёўшчына». З 2008 г. Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага праводзіць Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання», апублікавала выдатны зборнік матэрыялаў канферэнцыі. Даследаванні, выкананыя ў час падрыхтоўкі гэтых краязнаўчых форумаў, ствараюць аснову для распрацоўкі аднайменнай базы даных. На II Канферэнцыі разглядаўся буйны міжнародны праект «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю.І. Крашэўскага», рэалізацыя якога будзе важкім укладам для ўзнаўлення памяці аб таленавітым земляку.

Юбілеі абласных бібліятэк таксама сталі падставай да актывізацыі іх дзейнасці ў дадзеным кірунку. Так, Брэсцкая АБ да 70-годдзя з дня заснавання правяла навукова-практычную канферэнцыю «Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна», па выніках якой надрукавала зборнік матэрыялаў [1]. У 2010 г. да свайго 180-годдзя Гродзенская АБ правяла навуковую канферэнцыю і выпусціла адпаведнае юбілейнае выданне і г. д. [4; 5; 7; 13]. Гомельская АБ ажыццяўляе навуковае вывучэнне ў сваіх фондах кніжнай

---

[2] У друкаванай форме па выніках рэгістрацыі штогод выдаецца каталог «Інфармацыйныя рэсурсы Беларусі».

калекцыі Паскевічаў. Гэтыя буйныя формы навукова-даследчай работы не толькі ўзбагачаюць краязнаўства як галіну ведаў, але за бібліятэкамі замацоўваюць ролю навуковых цэнтраў краязнаўства – рэальных партнёраў рэгіянальных універсітэтаў, архіваў і краязнаўчых музеяў.

У ліку важных сучасных задач перад АБ стаіць неабходнасць інфармацыйнай падтрымкі краязнаўчага аспекту на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі. Базай развіцця гэтага напрамку з'яўляюцца багатыя інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы АБ, бесперапыннае назапашанне і структураванне дакументаваных ведаў аб рэгіёнах, удасканаленне іх прадастаўлення ў свабодным доступе.

Прысутнасць рэгіёназнаўчага кампанента ў шэрагу дысцыплін, што выкладаюцца ў сярэдняй школе, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, – устойлівая і абгрунтаваная з'ява ў адукацыйным і выхаваўчым працэсах. У апошнія дзесяцігоддзі ў сістэме адукацыі з'явіліся дзесяткі самастойных вучэбных дысцыплін краязнаўчага зместу, выходзяць праграмы і вучэбныя дапаможнікі [21]. У многіх навучальных установах дзейнічаюць краязнаўчыя музеі і гурткі. Але і ў сярэдняй, і ў вышэйшай школах вывучэнне краязнаўства моцна залежыць ад суб'ектыўных фактараў – наяўнасці педагога-краязнаўца, яго крэатыўнасці. З дапамогай такіх выкладчыкаў АБ магла б распрацаваць спецыяльныя праекты – урокі, экскурсіі або іншыя формы адлюстравання галоўных тэм вучэбных курсаў з дапамогай дакументальных крыніц, інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве. У гэтым жа аспекце прадстаўляюцца патрэбнымі і больш актыўныя дзеянні па рэкламе сфарміраваных бібліятэкамі інфармацыйных рэсурсаў у педагагічных колах, напрыклад віртуальных музеяў выдатных беларускіх пісьменнікаў, ураджэнцаў вобласці, створаных Гомельскай абласной бібліятэкай. Думаецца, што ўзаемадзенне абласных бібліятэк з навучальнымі ўстановамі ў дапамогу інфармацыйнаму забеспячэнню краязнаўчых дысцыплін і рэгіёназнаўчых кампанентаў іншых вучэбных прадметаў будзе садзейнічаць не толькі засваенню краязнаўчых ведаў, фарміраванню інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення ў будучых спецыялістаў, але і ўменню выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы і веды ў вучэбнай, а ў далейшым і прафесійнай дзейнасці па выбранай спецыяльнасці.

Наколькі сёння набыла актуальнасць праблема прадстаўлення нацыянальнай культуры ў глабалізаваным свеце, настолькі трэба ўлічваць, што абласныя бібліятэкі Беларусі належаць да надзейных і кампетэнтных устаноў, якія здольны на інфармацыйна-камунікатыўным і пазнавальным узроўнях уплываць на фарміраванне пазітыўнага інтарэсу да свайго рэгіёна ў наведвальнікаў Інтэрнэту, незалежна ад таго, рухае наведвальнікам навуковы ці дзелавы інтарэс або памкненні турыста.

Ацэньваючы накоплены вопыт і цікавыя пачынанні абласных бібліятэк як галоўных цэнтраў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства і буйнейшых суб'ектаў краязнаўчага руху ў краіне, ёсць падставы характарызаваць усебаковае праяўленне краязнаўчай функцыі ў іх дзейнасці, бачыць магчымыя перспектывы развіцця для стварэння дакументальнай і інфармацыйнай рэгіянальнай памяці, прадстаўнічага, унікальнага інфармацыйнага вобраза краю.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Берасцейскія** кнігазборы : матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання», Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г. / [складальнікі: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька ; пад агульнай рэдакцыяй М. В. Нікалаева]. – Брэст : Паліграфіка, 2010. – 463 с., [8] л. іл. : іл., табл.

2. **Библиотека-музей** как хранительница региональных и культурно-этнографических традиций : методические рекомендации по организации деятельности библиотек-музеев / Учреждение культуры «Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина», Отдел маркетинга и библиотековедческой работы ; [составитель Г. Н. Дятлова]. – Могилев : Могилевская областная библиотека, 2010. – 35 с. : табл.

3. **Библиотеки** как информационные центры культурного и экологического туризма / тематическую подборку составили методисты учебно-методического отдела СОУНБ им. В. Г. Белинского С. Е. Андреева и Л. Г. Кукарских. – Режим доступа: http://www.polevskoy-turcentr.ru/turbiblioteka/about-us.html.

4. **Библиотечное** краеведение как фактор повышения культурного потенциала края : методические материалы / Учреждение «Гомельская областная универсальная библиотека им. В. И. Ленина», Отдел библиотековедения ; [составитель М. С. Рафеева]. – Гомель : Гомельская областная универсальная библиотека, 2009. – 31 с. : табл.

5. **Брэсцкая** абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы

навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 7–8 красавіка 2010 г. : [зборнік дакладаў / складальнік А. М. Мяснянкіна ; пад агульнай рэдакцыяй С. Р. Рачэўскага]. – Брэст : Паліграфіка, 2010. – 151 с., [4] л. каляр. іл.

6. **Володин, Б. Ф.** Споры вокруг перспектив / Б. Ф. Володин // Библиотекарь. – 1984. – № 5. – С. 26–29.

7. **Галоўная** кніжніца Прынямоння : да 180-годдзя з дня заснавання ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага» ; [складальнікі: Л. В. Мальцава і інш.]. – Гродна : Гродзенская друкарня, 2010. – 119 с. : іл., партр., факсім.

8. **Государственный** регистр информационных ресурсов Беларуси. – Рэжым доступу: http://infores.mpt.gov.by/ir/database/.

9. **Грибков, Д. Н.** Формирование электронного информационного пространства региона: из опыта общедоступных библиотек Орловской области / Д. Н. Грибков, Е. В. Тимошук // Научные и технические библиотеки. – 2011. – № 6. – С. 75–79.

10. **Дзяржаўная** праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады : пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26.12.2010 № 1905. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/webnpa/text.asp?RN=C21001905.

11. **Дуброва, В. П.** Полифункциональная модель библиотеки XXI в. / Дуброва В. П. // Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 7–8 красавіка 2010 г. : [зборнік дакладаў / складальнік А. М. Мяснянкіна ; пад агульнай рэдакцыяй С. Р. Рачэўскага]. – Брэст, 2010. – С. 26–32.

12. **Ковенько, Т. С.** Краеведческий библиографический ресурс: проблемы формирования и использования / Ковенько Т. С. // Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 7–8 красавіка 2010 г. : [зборнік дакладаў / складальнік А. М. Мяснянкіна ; пад агульнай рэдакцыяй С. Р. Рачэўскага]. – Брэст, 2010. – С. 37–44.

13. **Краязнаўства** Берасцейшчыны: стан і перспектывы развіцця : матэрыялы «круглага стала», 12 снежня 2006 года / [рэдкалегія: Т. П. Данілюк, А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька]. – Брэст : БрДУ, 2007. – 56 с., [10] л. каляр. іл.

14. **Краязнаўчая** дзейнасць бібліятэк : метадычныя рэкамендацыі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнікі: Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал. – Мінск, 1994. – 102 с.

15. **Кукатова, Г. И.** Центральная библиотека региона: современный этап развития : [научно-практическое пособие] / Г. И. Кукатова. – Москва : Литера, 2010. – 143 с. : ил., табл. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 77).

16. **Кушнаренко, Н. Н.** Библиотечное краеведение: теоретико-методологический аспект : автореф. дис. … д-ра пед. наук / Н. Н. Кушнаренко ; МГИК. – Москва, 1993. – 16 с.

17. **Літаратурная** спадчына рэгіёна і Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна: рэсурсны патэнцыял у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці : зборнік дакладаў навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Магілёўская абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна / Установа адукацыі «Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел маркетынгу і бібліятэчнай работы ; [складальнік І. У. Малінін і інш.]. – Магілёў : Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна, 2010. – 30 с.

18. **Мотульский, Р. С.** Библиотека в социуме: предназначение и функции / Р. С. Мотульский // Библиотековедение. – 2002. – № 5. – С. 19–24.

19. **Мотульский, Р. С.** Общее библиотековедение : учебное пособие для вузов / Р. С. Мотульский. – Москва : Либерея, 2004. – 224 с.

20. **Положение** об обязательном бесплатном экземпляре документов [Электронны рэсурс] : пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 03.09.2008 г. № 1284 : [у рэд. ад 10.08.2009 г. № 1052]. – Рэжым доступу: http://pravo.by.

21. **Районоведение.** Октябрьский район г. Минска : [пособие для факультативных занятий учащихся общеобразовательных средних школ и гимназий / Т. И. Михалькевич и др.] ; Государственное учреждение образования «Общеобразовательная средняя школа № 90 г. Минска». – Минск : Республиканский институт высшей школы, 2011. – 103 с. : ил., портр. ; **Давидович, Е. Б.** Твоя столица: архитектура Минска : учебное наглядное пособие для педагогов учреждений дошкольного образования / Е. Б. Давидович. – Минск : Народная асвета, 2011. – 12, [2] с. – (Серия «Страницы родной земли») ; **Гісторыка-краязнаўчы** курс «Наша Шуміліншчына». Шуміліназнаўства / [укладальнікі: В. А. Падляшчук і інш. ; пераклад на беларускую мову М. А. Мароза]. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2010. – 199 с. : іл.; **Гродназнаўства** : дапаможнік па курсе «Краязнаўства» для студэнтаў гуманітарных спецыяльнасцяў / [А. П. Госцеў і інш.] ; пад агульнай рэдакцыяй В. В. Шведа, В. Р. Карнелюка ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы»]. – 2-е выд. – Гродна : ГрДУ, 2010. – 219 с. : іл. ; **Воложиноведение** [Электронный ресурс] : комплексная географическая характеристика Воложинского района : учебно-методическое пособие : электронное приложение / Управление образования Минского облисполкома, Минский областной институт развития образования, Отдел образования Воложинского райисполкома ; С. В. Федорако. – Минск : МОИРО, 2009. – 1 электронный оптический диск (CD-ROM) : цв., карты, текст, ил. ; 12 см. – Системные требования: Pentium III; 64 Mb RAM; MS Office XP; свободное место – 200 Mb. – Заглавие с титульного экрана. – Содержание: ГИС-атлас Воложинского района ; Атлас туризма Воложинского района ; Цифровой атлас топонимов ; иллюстрации, диаграммы, таблицы, тексты.

22. **Сарокіна, І. У.** Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна – буйнейшы інфармацыйны, адукацыйны і культурны цэнтр рэгіёна (да 75-годдзя ўстановы культуры) / Сарокіна І. У. // Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 7–8 красавіка 2010 г. : [зборнік дакладаў / складальнік А. М. Мяснянкіна ; пад агульнай рэдакцыяй С. Р. Рачэўскага]. – Брэст, 2010. – С. 105–108.

23. **Стрыжонак, І. М.** Краязнаўчая функцыя бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута грамадства / І. М. Стрыжонак, В. І. Саітава // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : сборник научных статей. Вып. 2. – Минск, 2008. – С. 681–686.

24. **Шатохина, Н. З.** Краеведческие библиографические ресурсы региона: состояние, перспективы развития : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата педагогических наук : 05.25.03 / Шатохина Наталья Захаровна ; [Федеральное государственное образовательное учреждение высшего профессионального образования «Орловский государственный институт искусств и культуры»]. – Москва, 2009. – 21, [1] с. : ил.

25. **Шышкін, У.** Бібліятэчныя ўстановы: вынікі дзейнасці бібліятэк краіны ў 2010 г. / У. Шышкін // Бібліятэчны свет. – 2011. – № 2. – С. 5–6.

**Ліхараў І.І.** (Магілёў)

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ МАНІТОРЫНГ ЯК ПЕРСПЕКТЫЎНЫ НАПРАМАК КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК: АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ

*Артыкул прысвечаны выкарыстанню інфармацыйнага маніторынгу ў рамках краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі. Раскрыты патэнцыял даступных бібліятэцы аб'етаў для інфармацыйнага маніторынгу: СМІ, даведачных выданняў, электроннага каталога Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, фондавага каталога дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь і інш.*

Інфармацыйны маніторынг вызначаецца як «працэс бесперапыннага сачэння за з'яўленнем новых звестак аб дзейнасці аб'екта па зададзеных інфармацыйных індыкатарах у сфарміраваным тэматычным полі з мэтай аналізу, кіравання і прагназавання яго развіцця» [1]. Журналістыка выкарыстоўвае тэрмін «маніторынг»